французы, каштоўнейшыя дакументы архіўных збораў ўсё адно пацярпелі ад рук расійскага войска: іх знішчалі на месцы або вывозілі, як паказала пазнейшая гісторыя, без магчымасці вяртання назад. Таму ў межах дадзенага артыкулу даць компексную ацэнку архіўным стратам немагчыма. Пытанне патрабуе вывучэння ў межах не толькі ўсіх пацярпелых гарадскіх архіваў, але таксама архіўных збораў у шляхецкіх сядзібах, кляштарах, храмах розных канфесій. Правядзенне глыбокага аналізу дадзенай тэмы дазволіць скласці поўную карціну страт, нанесеных беларускім архіўным зборам вайной 1812 года.


1. Антонава, Т. Ці стане Нясвіж турыстычнай Мекай? // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 63–67.
2. Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе «Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі» : даведнік / склад.: С. І. Паўловіч, Т. М. Мальцава. – Мінск–Полацк, 1999. – 386 с.
3. Афанасьева, Т. Национальному историческому архиву в Гродно – 65 лет / Т. Афанасьева // Архівы і справаводства. – 2005. – № 1. – С. 115–117.
4. Жиркевич, А. В. Смоленские архивы в 1812 г. / А. В. Жиркевич // Смоленская старина. – Смоленск, 1909. – С. 345–371.
5. Калубовіч, А. Мова ў гісторыі беларускага пісьменства / А. Калубовіч. – Ч. 1. – Мюнхэн–Лёндан, 1974–1975. – 84 с.
6. Караў, Д. Архіўная спадчына Вялікага Княства Літоўскага і беларускія архівы ў канцы XVIII – пачатку XX стст. / Д. Караў // Спадчына. – 1996. – № 1. – С. 3–25.
7. Клепікаў, М. Я. Румянцаўскі гурток і ахова помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / М. Я. Клепікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 1. – С. 60–66.
8. Латушкін, А. М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX сагоддзяў / А. М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С. 102–107.
9. Латушкін, А. М. Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790–1818 гг. / А. М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2005. – № 6. – С. 46–60.
10. Левко, О. Н. Витебск XIV-XVIII вв. : (Стратиграфия, хронология, социал. -ист. топография и технология пр-в) / науч. ред. В. А. Булкин. – Минск : Наука и техника, 1984. – 120 с.
11. Сачок, М. М. Мартыралог дакументальных помнікаў Гродзенскай губерні (Да гісторыі фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна) XIX-XX стст. / М. М. Сачок // Архівы Беларусі на рубяжы XX–XXI стст.: гісторыя, стан, перспектывы развіцця : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 лют. 2000 г. – Мінск : БелНДІДАС, 2001. – С. 99–104.
12. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII стст. / М. А. Ткачоў. – Минск : Навука і тэхніка, 1978. – 144 с.
13. Шимелевич, М. И. Город Лида и Лидский замок (исторический очерк) / М. И. Шимелевич // Виленский календарь. – Вильно, 1906. – С. 37–57.
14. Шумейко, М. Ф. Война 1812 года и белорусские архивы / М. Ф. Шумейко // Французская рэвалюцыя і лёсы свету : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. гадавіне Фр. рэвалюцыі (1789–1799 гг.), Мінск, 21–22 крас. 1999 г. / рэдкал.: У. С. Кошалеў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ. – 1999. – С. 159–160.
15. Шумейко, М. Ф. Архивоведение Беларуси : учебное пособие для студентов исторических факультетов вузов : в 2 ч. / М. Ф. Шумейко, К. И. Козак, В. Д. Селеменев. – Ч. 1. – Минск : Издательский центр РИВШ. – 1997. – 101 с.


**Карпекін К. Р.**

## АРХІВЫ І БІБЛІЯТЭКІ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЦЭРКВАЎ У 1918–1920-Я ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЁЗНЕНШЧЫНЫ)

У канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі найбольшая частка насельніцтва належала да праваслаўнага веравызнання. Цэрквы знаходзіліся ва ўсіх гарадах і мястэчках, у многіх сельскіх населеных пунктах і з'яўляліся важнымі сацыяльна-культурнымі цэнтрамі. Акрамя іншых функцый праваслаўныя святары займаліся асветніцкай і рэгістрацыйнай дзейнасцю, таму натуральным з'яўляецца ўзнікненне пры храмах архіваў і бібліятэк. Па сённяшні час здараюцца выпадкі знаходжання ў храмах пад час рамонтных работ дагэтуль невядомых метрычных кніг і старадрукаў.

Мэта дадзенага даследавання – прааналізаваць стан архіваў і бібліятэк праваслаўных цэркваў у сацыяльна нестабільны перыяд часу – 1918 – 1920-я гг. (на прыкладзе тэрыторыі сучаснага Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці).

Змена палітычнага ладу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. выклікала трансфармацыю сацыяльнай ролі праваслаўнай царквы, у сувязі з чым пачалася кампанія па перадачы метрычных кніг з храмаў органам мясцовай улады. Заканадаўчай базай дадзенага мерапрыемства стаў дэкрэт УЦВК і СНК РСФСР "Аб грамадзянскім шлюбе, аб дзецях і аб вядзенні кніг актаў стану" ад 18 снежня 1917 г. [1, с. 249]. У даследуемым рэгіёне найбольшая частка царкоўных архіваў была перададзена ў валасныя выканкамы ў 1918 г., прычым значная частка – восенню. Меліся і асобныя выпадкі больш позніх перамяшчэнняў: напрыклад, метрычныя кнігі Нова-Бельскай царквы апынуліся ў валвыканкаме 25 лютага 1919 г. Найбольш раннія кнігі датаваліся 1820-мі гг., а самыя позні – 1918 – 1919 гг. (іншымі словамі, святары рабілі запісы да моманту здачы архіваў). У гэты час з асобных цэркваў у валвыканкамы перадаваліся і іншыя дакументы: у прыватнасці, у 1918 г. такі лёс напаткаў прыхода-расходныя кнігі, царкоўны летапіс і кліравыя ведамасці Дабрамыслінскай царквы [8, арк. 18; 11, арк. 54 адв., 59, 64 – 64 адв., 67, 85, 90 адв.].



Рэпазіторый ВДУ

Калі згаданае вышэй перамяшчэнне, па сутнасці, азначала змену ўласніка архіваў і не павінна было кардынальным чынам адбіцца на ўмовах іх захавання, то адначасова адбываўся працэс бессэнсоўнага псавання царкоўных архіваў і бібліятэк. Так, у хуткім часе пасля рэвалюцыі 1917 г. архіў Веляшковіцкай царквы, які захоўваўся на гарышчы, часткова разрабавала мясцовая моладзь, бо тут не было вартаўніка, а ў 1921 г. некаторыя кнігі загадаў з гэтага ж храма былі пашкоджаны чырвонаармейцамі [8, арк. 17 адв., 18].

На стане царкоўных кніг адмоўным чынам адбілася і кампанія па канфіскацыі каштоўнасцяў на карысць галадаючых Паволжа. З праваслаўных храмаў Лёзненшчыны выняцці адбываліся на працягу красавіка – сярэдзіны чэрвеня 1922 г. Што тычыцца непасрэдна архіваў і бібліятэк, то канфіскоўвалі срэбныя і пазалочаныя абклады і ўпрыгожанні з вокладак Евангелляў [4, арк. 305, 310, 312, 314, 317, 328; 5, арк. 3]. У ліпені 1922 г. вырабы з каштоўных металаў, забраныя з цэркваў, былі дастаўлены ў Віцебскую губернскую камісію. З сямі цэркваў даследуемага рэгіёна было канфіскавана 111 накладак з Евангелляў, 9 навугольнікаў і 4 цвічкі для іх прымацавання (усе яны былі выраблены са срэбра і мелі агульную вагу 3, 45 кг) [2, арк. 3 адв., 21, 24, 32 адв. – 34].

У сувязі са зменай адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў БССР у 1924 г. архівы метрычных кніг былі сабраны з валвыканкамаў і перавезены ў райвыканкамы, дзе і захоўваліся цягам некалькіх гадоў [3, арк. 15].

У 1925 г. у рэспубліцы прайшла кампанія па вывучэнні царкоўных архіваў і бібліятэк, мэтай якой было выяўленне іх стану і зместу. На Лёзненшчыне дадзенае мерапрыемства доўжылася з ліпеня да верасня. У прыватнасці, 5 ліпеня 1925 г. была агледжана Лёзненская царква, 11 ліпеня 1925 г. – Бабінавіцкая, 13 ліпеня – Замшынская, 14 ліпеня – Дабрамыслінская, 17 ліпеня 1925 г. – Высачанская і Нова-Бельская, у пачатку верасня 1925 г. – Калышанская царква. Дзеля вывучэння архіваў і бібліятэк ствараліся спецыяльныя камісіі, у якія ўваходзілі, як правіла, старшыня ці іншы служачы сельсавета, школьны работнік з мясцовай школы і прадстаўнік ад праваслаўнай абшчыны (святар, царкоўны стараста ці старшыня царкоўнага савета). У працы такіх камісій таксама маглі ўдзельнічаць прадстаўнікі сялянскіх камітэтаў, загадчыкі хат-чытальняў.

Па выніках даследавання аказалася, што ў некаторых цэрквах архівы захоўваліся ў асобных драўляных шафах у рызніцах (як, напрыклад, у Новай Белі і Стасеве), у іншых – у алтарах, бакавых прыбудовах да цэркваў ці званіцах (у Лёзне, Замшыне, Калышках) [6, арк. 38 адв.; 9, арк. 146; 12, арк. 163].

У складзе архіваў мелася некалькі катэгорый дакументаў: 1) царкоўныя летапісы (як правіла, яны былі пачаты ў 1870-я ці 1880-я гг., і ахоплівалі падзеі да 1900-х гг.); 2) кліравыя ведамасці (у розных цэрквах колькасць кніг і іх храналагічныя межы значна адрозніваліся: 1 – 2 кнігі за 1910-я гг. у адных і некалькі дзясяткаў кніг за 1810-я – 1910-я гг. – у іншых); 3) метрычныя кнігі (адзінкавыя капійныя асобнікі за XIX – пачатак XX ст., а таксама запісы за 1918 – 1925 гг. – тыя, што вяліся ўжо пасля перадачы асноўнай масы кніг у валвыканкамы); 4) споведныя запісы (найбольш раннія з іх датаваліся пачаткам XIX ст., асноўная ж маса храналагічна ахоплівала 1840-я – 1910-я гг.); 5) шлюбныя вобыскі (у цэрквах мелася невялікая колькасць такіх кніг – ад 7 да 17, якія храналагічна ў цэлым супадалі са шлюбнымі вобыскамі); 6) прыхода-расходныя кнігі (пераважная большасць дакументаў была створана ў 1830-я – 1850-я гг., а завершана ў пачатку XX ст. ці ў 1910-я гг.).

У некаторых царкоўных архівах захоўваліся і іншыя віды дакументацыі. Напрыклад, у асобных храмах Лёзненшчыны меліся адзінкавыя кнігі загадаў за 1865 г. і за пачатак 1920-х гг., кнігі ўваходзячых папер за 1850-я – 1860-я гг., кнігі сінадальных і кансісторскіх указаў за 1880-я – 1910-я гг. Нешматлікімі з'яўляліся і вопісы маёмасці (выяўленыя асобнікі адносіліся да сярэдзіны XIX ст.), пры чым у некаторых храмах маглі захоўвацца вопісы суседніх цэркваў (у прыватнасці, вопіс маёмасці Добрынскай царквы захоўваўся ў Высачанах).

Бібліятэкі праваслаўных цэркваў умоўна падзяляліся на 2 часткі: 1) багаслужбовыя кнігі, 2) выданні асветніцкага характару. Як правіла, у храмах налічвалася ад 30 да 70 багаслужбовых кніг. Звычайна ў цэрквах мелася ад 3 да 5 Евангелляў, аздобленых чырвонымі аксамітнымі вокладкамі (гл. ілюстрацыі 1 – 5). Многія з іх былі ўпрыгожаны металічнымі накладкамі: верхнія вокладкі – пласцінамі з выявай уваскрасення Хрыста і навугольнікамі з выявамі евангелістаў, а ніжнія – дошкамі з выявай распяцця і таксама чатырма навугольнікамі [6, арк. 30; 9, арк. 146; 12, арк. 163]. У многіх цэрквах меліся досыць арыгінальныя выданні: так, у Веляшковіцкім храме захоўваліся "Апостал" (выдадзены ў 1684 г. у Маскве), "Евангелле" (выдадзена ў 1753 г. у Львове), 7 кніг для набажэнстваў на латышскай мове, у Лёзненскай царкве – 3 рукапісныя кнігі на польскай мове другой паловы XVIII ст., у Калышанскай царкве – "Літургія" 1846 г. выдання (гл. ілюстрацыю 6).

Рэпазіторый ВДУ



Рыс. 1



Рыс. 2



Рыс 3



Рыс. 4



Рыс. 5



Рыс. 6

Ілюстрацыі: 1 – 5 – Напрастольнае Евангелле 1816 г. выдання з Лёзненскай Узнесенскай царквы, фотаздымак 1982 г. [10, акр. 2, 25 – 29]
6 – "Пяцідзясятніца" 1780 г. выдання з Лёзненскай Узнесенскай царквы, фотаздымак 1982 г. [10, акр. 2, 32]

Бібліятэкі з выданняў асветніцкага характару адрозніваліся па сваіх памерах (самыя сціплыя налічвалі да 20 тамоў, найбольш багатыя – звыш 170). Тут захоўваліся кнігі кшталту "Гісторыя Фларэнційскага сабора" (1847 г. выдання), "Слова прыходскага святара да сваёй паствы" (1856 г.), "Гісторыя хрысціянскай царквы" (1861 г.), "Словы і прамовы архіепіскапаў" (1866 г.) і інш. [6, арк.

Рэпазіторый ВДУ

30, 31 адв. – 33, 39 – 41 адв.]. Акрамя кніг меліся перыядычныя выданні (“Царкоўны веснік”, “Епархіяльныя ведамасці” і інш.).

Па завяршэнні агляду адказнымі за захаванасць пералічаных матэрыялаў былі прызначаны святары, псаломшчыкі ці царкоўныя старасты. У Дабрамыслінскай царкве адказным стаў адзін з вернікаў (верагодна, царкоўны стараста, які пражываў у іншай вёсцы, не мог назіраць за захаванасцю архіва). Усе яны напісалі распіскі на адрас Віцебскага акруговага аддзела Цэнтральнага архіва БССР [8, арк. 17 – 18 адв. ; 11, арк. 53 – 54, 58 – 68, 84 – 86, 88 – 90].

У 1929 г. адбылося чарговае перамяшчэнне метрычных кніг: з пададдзелаў ЗАГС райвыканкамаў яны былі перададзены сельскім Саветам. На тэрыторыі Лёзненшчыны ўказанае мерапрыемства прайшло вельмі аператыўна (22 кастрычніка 1929 г. быў перавезены архіў Лёзненскай царквы, а 23 кастрычніка – астатніх праваслаўных храмаў раёна) [7, арк. 50 – 54].

Параўнанне храналагічных межаў метрычных кніг, якія захоўваліся ў архівах дзяржаўных устаноў у 1920-я гг., дае падставу меркаваць, што за кароткі прамежак часу частка кніг была страчана (верагодна, пры перамяшчэнні), а некаторыя кнігі наадварот выяўлены (гл. табліцу). Адначасова нельга выключаць варыянт няякаснага складання вопісаў, з-за чаго ў архіўныя дакументы патрапіла некарэктная інфармацыя. Паколькі храналагічныя межы кніг, якія захаваліся па сённяшні дзень, значна адрозніваюцца ад стану архіваў 1920-х гг., можна меркаваць, што значная частка асобнікаў, складзеных у цэрквах, была страчана, таму ў сучасных дзяржаўных архівах захоўваюцца пераважна асобнікі, у свой час адпраўленыя святарамі ў духоўныя кансісторыі.

Табліца – Захаванасць метрычных кніг Дабрамыслінскай Пакроўскай і Нова-Бельскай Успенскай цэркваў у 1920-я гг.

| Паводле стану на пэўны год | Храналагічныя межы метрычных кніг | |
|---|---|---|
| | Дабрамыслінскай Пакроўскай царквы | Нова-Бельскай Успенскай царквы |
| 1924 г. | пра народжаных за 1835 – 1918 гг., пра памерлых за 1841 – 1918 гг., пра шлюбы за 1841, 1859 – 1871, 1880 – 1888, 1890 – 1900, 1910 – 1911 гг. | – |
| 1929 г. | пра народжаных за 1835 – 1918 гг., пра памерлых за 1841 – 1871, 1880 – 1897, 1902 – 1918 гг., пра шлюбы за 1859 – 1900, 1910 – 1911 гг. | пра народжаных за 1839 – 1919 гг., пра памерлых за 1856 – 1881, 1888 – 1918 гг., пра шлюбы за 1849 – 1871, 1888 – 1918 гг. |
| У сучасны момант захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (г. Мінск) | пра народжаных за 1835 – 1857, 1859 – 1860, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881, 1916 гг., пра памерлых за 1859 – 1860, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881, 1916 гг., пра шлюбы за 1859 – 1860, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881, 1916 гг. | пра народжаных за 1839, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881 гг., пра памерлых за 1839 – 1855, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881 гг., пра шлюбы за 1839 – 1848, 1871 – 1872, 1875, 1877 – 1878, 1881 гг. |

Заўвага – Табліца складзена аўтарам паводле [3, арк. 15; 7, арк. 50 – 54].

Такім чынам, у 1918 – 1920-я гг. праваслаўныя цэрквы з'яўляліся важнымі асяродкамі захоўвання архіўных матэрыялаў і бібліятэк. Яны характарызаваліся адносна ўніфікаванай структурай, але зместавае напаўненне кожнага з іх адлюстроўвала асаблівасці развіцця кожнага храма і абшчыны. У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі на працягу даследуемага перыяду адбывалася парушэнне цэласнасці царкоўных архіваў і бібліятэк, часткова яны былі страчаны.


1. Декреты Советской власти : в 13 т. / редкол.: Г. Д. Обичкин [и др.]. – М. : Политиздат, 1957. – Т. 1 : 25 октября 1917 г. – 16 марта 1918 г. – 625 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 9. Воп. 1. Спр. 409.
3. ДАВц. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 584.
4. ДАВц. – Ф. 123. Воп. 1. Спр. 755.
5. ДАВц. – Ф. 123. Воп. 1. Спр. 763.
6. ДАВц. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 3.
7. ДАВц. – Ф. 160. Воп. 1. Спр. 40.
8. ДАВц. – Ф. 289. Воп. 1. Спр. 59.
9. ДАВц. – Ф. 571. Воп. 1. Спр. 23.
10. ДАВц. – Ф. 1439. Воп. 6. Спр. 3.
11. ДАВц. – Ф. 1947. Воп. 1. Спр. 19.
12. ДАВц. – Ф. 2458. Воп. 1. Спр. 1.


Репозиторий ВГУ